УДК [069:550.384.32]:304.4(476)

**Я. І. Мікула,**
*кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара ўстановы «Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь;*

**Я. С. Патапенка,**
*загадчык культурна-адукацыйнага аддзела ўстановы «Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ДА ПЫТАННЯ АБ ПРАКТЫЦЫ ЗАХАВАННЯ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЕЯ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ

**Анатацыя.** *Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту ў сваёй дзейнасці ў сферы захавання і папулярызацыі нематэрыяльнай спадчыны кіруецца шэрагам міжнародных дакументаў і Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры пры вывучэнні культурнай спадчыны беларускага народа, абрадаў, традыцый і звычаяў, фальклору, танцаў, песень і іншых нематэрыяльных праяў творчасці чалавека. Сёння музей з’яўляецца выдатнай пляцоўкай для вывучэння і рэканструкцыі земляробчых і каляндарных абрадаў.*

**Ключавыя словы:** *спадчына, музей, абрад, рэканструкцыя, фальклор, песні, музычныя інструменты, фэсты, традыцыі.*

**Y. Mikula,**
*PhD in History, deputy director of* the Institution *"Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle", Minsk, Republic of Belarus;*

**Y. Patapienka,**
*Head of the cultural and educational department of* the Institution *"Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle", Minsk, Republic of Belarus*

# SAVING AND POPULARIZATION OF INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE IN BELARUSIAN STATE MUSEUM OF FOLK ARCHITECTURE AND RURAL LIFESTYLE

**Abstract.** *The Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle in its activities in the field of preservation and popularization of intangible heritage is guided by a number of international documents and the*

*Code of the Republic of Belarus on Culture when studying the cultural heritage of the Belarusian people, rites, traditions and customs, folklore, dances, songs and other intangible manifestations of creativity of person. Today, the museum is an excellent place for studying and reconstructing agricultural and calendar rites.*

**Key words:** *heritage, museum, ceremony, reconstruction, folklore, songs, musical instruments, festivals, traditions.*

Культурная спадчына неад'емна звязана з дзейнасцю музейных устаноў Беларусі. Матэрыяльныя і нематэрыяльныя, рухомыя і нерухомыя культурныя каштоўнасці аказваюць значны ўплыў на розныя сферы жыцця сучаснага грамадства. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту надае значную ўвагу нематэрыяльным праявам чалавечай дзейнасці ў традыцыйнай культуры. Для вызначэння тэрміна «нематэрыяльная культурная спадчына» звернемся да нарматыўна-прававых дакументаў.

Асноўны дакумент, якім кіруюцца музейныя ўстановы Беларусі ў працэсе ажыццяўлення сваёй дзейнасці, – Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры.

Артыкул 69 Кодэкса кажа: «Да нематэрыяльных культурных каштоўнасцей адносяцца звычаі, традыцыі, абрады, фальклор (вусная народная творчасць), беларуская мова (вусная і пісьмовая), іншыя мовы, імёнаслоўныя традыцыі і традыцыйныя нацыянальныя формы звароту да людзей, змест геральдычных аб'ектаў, уласных геаграфічных назваў (тапонімаў) і вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, іншыя нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека» [2, с. 50]. Пры падрыхтоўцы Кодэкса аб культуры ўлічваліся палажэнні як айчынных нарматыўна-прававых дакументаў, так і міжнародных.

Важнейшым дакументам сусветнага ўзроўню з'яўляецца Міжнародная канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, прынятая Генеральнай канферэнцыяй ЮНЕСКА ў Парыжы ў верасні-кастрычніку 2003 г. Згодна з пунктам 1 артыкула 2 нематэрыяльная спадчына разглядаецца як «звычаі, формы падачы і выражэння, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, прызнаныя супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны. Такая нематэрыяльная культурная спадчына, якая перадаецца ад пакалення да пакалення, пастаянна ўзнаўляецца супольнасцямі і групамі ў залежнасці ад навакольнага ім асяроддзя, іх узаемадзеяння з прыродай і іх гісторыі, і фарміруе ў іх пачуццё самабытнасці і пераемнасці, садзейнічаючы тым самым павазе да культурнай разнастайнасці і творчасці чалавека. Для мэт дадзенай Канвенцыі прымаецца да ўвагі толькі тая нематэрыяльная культурная спадчына, якая стасуецца з існуючымі міжнародна-прававымі актамі па правах

чалавека і патрабаваннямі ўзаемнай павагі паміж супольнасцямі, групамі і прыватнымі асобамі, а таксама ўстойлівага развіцця» [1]. Гэты дакумент абавязвае дзяржавы-ўдзельніцы «прымаць неабходныя меры для забеспячэння аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая маецца на іх тэрыторыі». Канвенцыя была ратыфікавана Рэспублікай Беларусь 29 снежня 2004 г. і пачала дзейнічаць 20 красавіка 2006 г.

Статус музея пад адкрытым небам вымушае і абавязвае навуковы калектыў скансэна ў адпаведнасці з гэтымі дакументамі займацца вывучэннем культурнай спадчыны беларускага народа, абрадаў, традыцый і звычаяў, фальклору, танцаў, песень і іншых нематэрыяльных праяў творчасці чалавека. На працягу ўсяго каляндарнага года ў Беларускім дзяржаўным музеі пад адкрытым небам нематэрыяльная спадчына беларускага народа актыўна папулярызуецца праз народныя песні, танцы, музычныя найгрышы на рэканструкцыі разнастайных абрадаў.

Энцыклапедыя «Этнаграфія Беларусі» трактуе абрады як «сукупнасць традыцыйных умоўных дзеянняў, што сімвалічна выражаюць і замацоўваюць адносіны людзей да прыроды і паміж сабою, іх паводзіны ў важных жыццёвых сітуацыях, якія сістэматычна паўтараюцца» [4, с. 14]. Старажытная абраднасць лягла ў аснову традыцый калядавання, шчадравання, валачобніцтва і інш. Абрады ў аснове сваёй захавалі народную спецыфіку і нацыянальны каларыт. Яны звычайна суправаджаюцца песнямі, карагодамі, танцамі, пераапрананнем. Галоўнымі сярод іх з’яўляюцца земляробчыя і каляндарныя абрады [4, с. 14–15]. Гэтыя працэсы шырока аналізаваліся ў літаратуры (напрыклад, артыкул А. Б. Сташкевіч [3]), але што тычыцца дзейнасці нашага музея ў дадзеным напрамку, то аналіз да цяперашняга часу не праводзіўся паўнавартасна.

Вывучэнне і рэканструкцыя земляробчых і каляндарных абрадаў з’яўляецца асноўнай мэтай музея ў папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны. З моманту заснавання ў 1976 г. музей паступова рабіўся пляцоўкай для правядзення вядомых у народзе свят, такіх як «Каляды», «Масленіца», «Гуканне вясны», «Зялёныя сьяткі», «Купалле». З кожным годам колькасць арганізаваных свят павялічвалася. Штогод пачалі праводзіцца «Тры каралі», «Грамніцы», «Юр’я», «Зажынкі», «Багач», «Пакроўскі кірмаш», «Дзяды», «Піліпаўскія вячоркі» і інш.

Правядзенне традыцыйных свят стала неад’емнай часткай тэрыторыі музея пад адкрытым небам. У студзеньскія маразы сьвяткуюцца «Каляды» – свята, якое храналагічна займае першае месца ў годзе. У музеі звычайна праводзяцца характэрныя для гэтага часу абрады – абыход двароў з калядоўшчыкамі, традыцыйныя варожбы (у 2017 г. для варожбаў з зернем выкарыстоўвалі нават жывога пеўня). У 2020 г. была зроблена рэканструкцыя святкавання Галоднай куцці на Міншчыне. Далучыцца да традыцый мінулага можна і на паказе лялечнага тэатра «Батлейка» з тыповым прадстаўленнем «Цар Ірад», паказе ценявога

тэатра «Вяртэп» з в. Бездзеж Драгічынскага раёна. Па этнаграфічных апісаннях супрацоўнікамі музея была адноўлена маска Дзеда з в. Рог Салігорскага раёна – персанажа ў гурце калядоўшчыкаў. Ажыўляюць атмасферу свята фальклорныя калектывы, напрыклад «Явар» (кіраўнік С. Р. Балцэвіч), «Скарбніца традыцый» (кіраўнік І. В. Хамутова), гурт «Этнасуполка» БДУКМ (кіраўнік Т. А. Пладунова).

У канцы зімы – пачатку вясны ў музеі праходзіць «Масленіца» – провады маразоў і набліжэнне вясны з магічнымі карагодамі, народнымі гульнямі і традыцыйнымі блінамі. Навуковыя супрацоўнікі музея звычайна дэманструюць масленічныя абрады «Пахаванне дзеда» (з в. Маскаляняты Гарадоцкага раёна), «Ушанаванне бабкі-павітухі», «Вешанне калодак» (па звестках з Талачынскага раёна), спальванне пудзіла Марэны. У апошні дзень масленічнага тыдня ў музеі святкуецца «Даравальная нядзеля»: праводзяцца абрады «Трызна» (з Любанскага раёна) і «Пахаванне бабы» (з в. Маскаляняты Гарадоцкага раёна). Завяршаецца свята элементам, які прыйшоў у традыцыі святкавання Масленіцы ў Беларусі досыць позна, але паспеў стаць самым запамінальным – спальваннем пудзіла Марэны пад карагоды, песні і народную музыку.

Штогод на «Гуканне вясны» ў музеі збіраецца моладзь, гучаць песні-«вяснянкі», водзяцца карагоды. У якасці абрадавага суправаджэння на гэта свята адбываецца развешванне каляровых птушак, шэсце да ракі, катанне на баране дзяўчыны-«вяснянкі», спальванне драўлянага кола на плыце, пушчаным па рацэ Пціч.

«Вербная нядзеля» далучае наведвальнікаў да традыцый упрыгожвання галінак вярбы, а на «Вялікдзень» дэманструюцца традыцыйныя спосабы аздаблення яек – «пісанкі», «крашанкі», «драпанкі» і традыцыйныя велікодныя гульні – «Катанне яек».

Адбываецца ў музеі пад адкрытым небам і свята «Юр'я», прымеркаванае да першага выгану статка ў поле, на «Юр'еву расу», якой у народных вераваннях надавалася цудадзейная моц. У музеі на Юр'е выводзяць статак (у выглядзе 2 музейных коней) на поле, праводзіцца абрад абыходу двароў (з Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці), абрад агляду нівы (з Вілейскага раёна Мінскай вобласці), рытуальныя дзеянні для аховы статку ад змей (з Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці).

У канцы чэрвеня – пачатку ліпеня ў музеі гарыць ачышчальны купальскі агонь, моладзь шукае чароўную папараць-кветку. Традыцыйнымі для Купалля ў музеі сталі абрады – пляценне купальскіх вянкоў, варажба на іх і зеляніне, купальскае шэсце з песнямі, катанне хлопцамі па вёсцы старога кола, выкатванне з вёскі ступы, вогнішча са скокамі.

У канцы лета святкуюцца «Зажынкі» і «Дажынкі», стражытныя земляробчыя святы, звязаныя з пачаткам і заканчэннем жніва. Традыцыйны атрыбут свят – першы і апошні сноп. На ўласныя вочы можна ўбачыць, як рабілі «перавясла» для снапа, як ушаноўвалі гаспадароў і ніву.

За апошнія некалькі гадоў музей таксама адрадзіў правядзенне такіх свят, як «Тры каралі» (2020, 2022 гг.), «Пакроўскі кірмаш» (2018–2021 гг.), «Дзяды» (2018, 2020 гг.), «Багач» (2017–2021 гг.), «Пііпаўскія вячоркі» (2017–2021 гг.).

Дэманструюцца ў музеі пад адкрытым небам і рэканструкцыі асобных абрадаў студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У красавіку 2019 г. быў рэканструяваны абрад «Ваджэнне куста» (з в. Любча Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці). У 2016 г. на базе музея праводзілася рэканструкцыя абраду «Вяселле ў маладой» (паводле рэгіянальных традыцый Лельчыцкага Палесся) гуртом «Этнасуполка» пад кіраўніцтвам Т. А. Пладуновай. Этнаграфічныя матэрыялы былі сабраны студэнтамі і выкладчыкамі падчас экспедыцый у Лельчыцкі раён Гомельскай вобласці. Вясельныя песні, гукі скрыпкі, дуды і цымбалаў разносіліся далёка за тэрыторыю музея.

Кожнае свята і абрадавыя дзеянні суправаджаюцца народнымі песнямі. Іх выконваюць як запрошаныя фальклорныя калектывы, так і супрацоўнікі музея. Супрацоўнікамі музея ажыццяўляецца вывучэнне песень да кожнага абраду па матэрыялах архіваў (ІМЭФ НАН Беларусі, Студэнцкага этнаграфічнага таварыства, У. Бярберава), нотных запісаў з кніг («Традыцыйная мастацкая культура Беларусі»), апублікаваных аўдыяматэрыялаў («Народныя песні Беларускага Панямоння», «Этнічная музыка беларусаў: Старадарожскі раён Мінскай вобласці» і г. д.).

Праводзяцца ў музеі і масавыя фестывалі, на якіх акрамя сучаснай фолк-музыкі наведвальнікі маглі пачуць спевы аўтэнтычных народных калектываў. На фестывалі «Купальскае кола» ў 2019 г. дэманстравалася традыцыя спеваў антыфонам з Полаччыны гуртом «Варган», праводзіўся ўнікальны абрад «Барана», завіванне вялізнай купальскай касы, якую цягнулі амаль з дзясятак дзяўчат у народных строях з грамадскай арганізацыі «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства». Выступленні палескіх аўтэнтычных калектываў «Хатовічы» з в. Хатынічы Ганцавіцкага раёна і «Церабяначка» з в. Церабень Пінскага раёна, а таксама паказ палескай батлейкі ад сям'і Быцко стваралі непаўторную атмасферу купальскага свята.

Праводзяцца ў музеі і мерапрыемствы забаўляльнага характару на аснове традыцыйных гульняў. У 2022 г. адбылася «Спартакіяда пабеларуску», падчас якой удзельнікі былі аб'яднаны задачай прайсці спаборніцтвы на час, хуткасць, кемлівасць. У аснове спаборніцтваў – традыцыйныя гульні і забавы, такія як «Свіння», «Гарадкі», «Закідалы».

Асобная старонка работы музейных супрацоўнікаў – гэта выкарыстанне песень і музычных інструментаў падчас тэматычных і інтэрактыўных экскурсій, музейных заняткаў у сярэдніх школах г. Мінска. Напрыклад, з 2018 г. супрацоўнікамі П. Ю. Кураповіч і Я. С. Патапенка выконваліся велікодныя песні ў помніку «Хата з в. Заброддзе Стаўбцоўскага раёна», а калядныя песні гучалі ў помніку «Хата з в. Садавічы

Капыльскага раёна» за святочным сталом. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца майстар-класы па развучванні традыцыйных песень з наведвальнікамі. Кожнаму госцю даецца аркуш з тэкстам песні і месцам яе фіксавання. Пад кіраўніцтвам музейнага супрацоўніка разбіраецца тэкст і мелодыя твора, тлумачацца рэгіянальныя асаблівасці гукавывядзення.

Традыцыйныя песні з'яўляюцца стандартным атрыбутам пры сустрэчы міжнародных дэлегацый, адкрыцці вялікіх камерцыйных альбо няпрофільных для музея мерапрыемстваў. Песня як віншаванне ўзрушвае наведвальнікаў, пакідае добрае ўражанне аб музеі, далучае людзей да народных традыцый і застаецца асабістай «зарубкай на памяць» для кожнага. Такім чынам, музей займаецца адраджэннем традыцыйнай песеннай абраднасці ў штодзённым жыцці.

У музеі можна пачуць і гукі музычных найгрышаў на традыцыйных інструментах. Дуда, скрыпка, цымбалы, акардэон, акарына, бубен зачароўваюць наведвальнікаў у любое надвор'е. Супрацоўнікамі музея вядзецца дзейнасць па расшыфроўцы музычных найгрышаў і далейшая рэпрэзентацыя іх падчас абрадаў.

На жаль, носьбітаў музычных традыцый з кожным годам становіцца ўсё менш. Аднак у 1980-я гг. велізарны пласт інфармацыі быў сабраны апантанымі музыкамі і этнографамі – Алесем Ласём і Уладзімірам Бярберавым. Менавіта дзякуючы іх працы традыцыйная музычная культура рэтранслюецца ў сучаснае грамадства. На працягу 2021–2022 гг. супрацоўнік культурна-адукацыйнага аддзела Я. С. Патапенка пераймала ў Алеся Лася цымбальныя найгрышы і народныя прыёмы ігры, запісаныя ім у свой час ад народных музыкаў. Уладзімір Бярбераў з'яўляўся кансультантам пры падрыхтоўцы матэрыялаў пра асаблівасці канструкцыі цымбалаў, выкананых рознымі народнымі майстрамі музычных інструментаў.

Штогод адбываюцца экспедыцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. У лістападзе 2021 г. супрацоўнікамі музея здзейснена экспедыцыя ў Вілейскі раён Мінскай вобласці. Падчас экспедыцыі былі атрыманы звесткі пра асаблівасці традыцыйных свят, занатаваны імёны мясцовых музыкаў і ўзяты на даследаванне бабіны з запісамі ігры народных музыкантаў з ваколіц Даўгінава.

Па ўспамінах Івана Ягела (10.03.1934 г. н.), у вёсцы Даўгінава яшчэ ў 1950-я гг. жыў скрыпач Савіцкі, які іграў і рабіў скрыпкі, якія прадаваў мясцовым яўрэям.

Былі ў Даўгінаве і іншыя музыканты, якіх актыўна запрашалі на вяселлі ў 1950-х гг. Гралі ў ансамблі на баяне, акардэоне і цымбалах. Рэпертуар музыкантаў складаўся з вальсаў, факстротаў, танга, полькі.

Прыгадвае Іван Ягела і пра святкаванне Калядаў. Калядаваць хадзілі толькі дзяўчаты, невялікім гуртом, па 5–6 чалавек. Асноўным атрыбутам свята былі калядныя песні і «бэтлеемка» – невялічкая хатка на палцы, зробленая з кардону, са свечкай і выявамі святых унутры.

Традыцыйныя песні і найгрышы, народныя танцы і гульні актыўна папулярызуюцца навуковымі супрацоўнікамі музея на музейна-педагагічных занятках. Такія заняткі з'яўляюцца важнай часткай дзейнасці музея, прадугледжваюць працу з дзецьмі рознага ўзросту і дэманстрацыю музейных прадметаў. Беларускім дзяржаўным музеем народнай архітэктуры і побыту праводзяцца «Прывітанне, музей», «Народны ўзор», «Кола часу», «Вячоркі», «Музычныя інструменты», «Традыцыйны беларускі строй». Дзеці з 1-га класа спазнаюць адрозненні беларускіх традыцыйных інструментаў, запамінаюць словы і гучанне песень у народных гульнях, вывучаюць традыцыі народных свят на працягу ўсяго каляндарнага года.

Такім чынам, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту здзяйсняе вялікую працу па захаванні, вывучэнні і рэканструкцыі абрадаў нематэрыяльнай спадчыны. Супрацоўнікі музея распаўсюджваюць веды пра нематэрыяльную спадчыну сярод наведвальнікаў розных узроставых катэгорый праз рэканструкцыю абрадаў, выкананне песень, танцаў як на інтэрактыўных і тэматычных экскурсіях, так і праз правядзенне шматлікіх этнаграфічных свят.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


*1.* Жывая спадчына Беларусі (інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны) [Электронны рэсурс]. – Код доступу: https://livingheritage.by/unesco/konventsiya-2003. – Дата доступу: 15.07.22.

*2.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г.: уступае ў сілу з 3 лют. 2017 г. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэсп. Беларусь, 2016. – 272 с.

*3. Сташкевіч, А. Б.* Захаванне і адказнае выкарыстанне нематэрыяльнай культурнай спадчыны як дзейсны фактар устойлівага развіцця грамадства / А. Б. Сташкевіч // Народная художественная культура в контексте процессов глобализации : материалы Междунар. науч.-практ. конф., г. Бобруйск, 28–29 июня 2013 г., в рамках Междунар. фестиваля нар. творчества «Венок дружбы», сост. О. И. Басько. – Минск, 2013. – С. 54–58.

*4.* Этнаграфія Беларусі : энцыкл. / Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с. : іл.